**Зязюлін, М.** Інтэрнацыяналіст / М. Зязюлін // Ленінская іскра (Сянно). — 1988. — 23 лют. — С. 2.

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТ



– Як складваецца пасляармейскае жыццё? – пытанне, бачна па ўсяму, не спадзяванае для Аляксандра. Ён непрацягла маўчыць, збіраючыся думкамі.

– Праз год пасля дэмабілізацыі ажаніўся. Тут, у родным Багушэўску, жыву, працую. Работа падабаецца. Усё добра адным словам.

Не красамоўны чалавек, як пераконваюся, Аляксандр Шчамялёў. У чатырох сказах усё самае важнае, асноўнае. Коратка, па-салдацкі.

...Не падобная на нашу прырода, нязвыклае адзенне, незразумелыя традыцыі, чужая мова афганскіх сялян… Дзеля іх шчасця больш года побач са смяротнай небяспекай. Баі – адзін з якіх ледзь не стаў апошнім. Доўга будзе памятаць Аляксандр памярцвелы твар, цяжкае, прабітае кулямі цела і гарачую кроў сябра на сваіх руках.

Больш тыдня праследвалі савецкія салдаты банду душманаў. І перамаглі, разбілі «духаў», хаця былі і з нашага боку страты. За той бой Аляксандр узнагароджаны медалём «За адвагу».

– Якую якасць характару больш усяго цэніце вы ў людзях, Аляксандр?

– Сумленнасць.

**М. Зязюліна**